| Афіцыйна | Трагедыя | Рэгіёны |
|---|---|---|
| *Стар. 4-5* | *Стар. 6-8* | *Стар. 10-11* |

№47
САКАВІК 2009

# Выбар

Газэта Магілёўскай абласной кааліцыі дэмакратычных сілаў

# Адбылася шостая асамблея недзяржаўных арганізацыяў ды ініцыятыў

У Менску 6-7 сакавіка сабраліся 330 прадстаўнікоў НДА, замежныя госьці, а таксама журналісты незалежных і ўрадавых мэдыяў. Гэтае мерапрыемства стала найбуйнейшым форумам НДА ў дванаццацігадовай гісторыі праўядзеньня падобных сходаў.

Сустрэча адкрылася словамі Аляксандра Патупы і Вінцука Вячоркі, якія былі сярод заснавальнікаў Асамблеі НДА ў 1997 г. Свае вітальныя прамовы сказалі таксама Аляксандар Мілінкевіч і Аляксандар Казулін (які выступіў перад абмеркаваньнем заявы, прысьвечанай палітычным рэпрэсіям), амбасадар Швэцыі Стэфан Эрыксан. Хаця арганізатары даслалі запрашэньне да ўдзелу ў прэзыдэнцкую адміністрацыю, улады вырашылі праігнараваць яго.

Працяг на стар. 2



ДЭЛЕГАЦЫЯ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ БЫЛА СКЛАДЗЕННАЯ З ПРАДСТАЎНІКОЎ УСІХ РЭГІЁНАЎ

# Адбылася шостая асамблея

Працяг. Пачтак на стар. 1

Ацэньваючы ў сваім выступе сытуацыю ў беларускім трэцім сэктары, старшыня Рабочай групы Асамблеі НДА Сяргей Мацкевіч падкрэсьліў: “Глябальных зьменаў не назіраецца ні ў цэнтры, ні ў рэгіёнах. Можа зьмянілася рыторыка ўладаў да больш памяркоўнай, а ў сваіх дзеяньнях яны ўсё роўна кіруюцца тым заканадаўствам, якое ёсьць, а яно ў вялікай ступені рэпрэсіўнае. І тымі звышмэтамі – не дапусьціць да легальнай дзейнасьці апанэнтаў улады. Зьявіліся, нажаль, новыя формы перасьледу актывістаў. Мы жадаем рэальных, а не касмэтычных зьменаў у сытуацыі”.

Удзельнікі заслухалі ды абмеркавалі справаздачы шасьці рэгіянальных і шасьці тэматычных круглых сталоў, што былі праведзеныя ў студзені-лютым гэтага году ў межах падрыхтоўкі да Асамблеі. Тэмамі гэтых сталоў былі правы чалавека, экалягічны актывізм, сацыяльныя і жаночыя НДА, грамадзянская адукацыя, новыя мэдыі як форма грамадзкай актыўнасьці, пытаньні дзейнасьці НДА ў канкрэтных рэгіёнах. Бальшыня выступоўцаў адзначыла нэгатыўныя тэндэнцыі пагаршэньня ўмоваў для грамадзянскай супольнасьці ды рэалізацыі права на свабоду асацыяцыяў, нягледзячы на г.зв. "лібэралізацыю". Падобныя высновы таксама ўтрымліваліся ў маніторынгах, якія былі падрыхтаваныя супольнымі намаганьнямі шэрагу НДА.

Цягам абодвух дзён мерапрыемства адбываўся Фэст грамадзкага актывізму, у першы - выстава стэндаў, а ў другі НДА знаёмілі калегаў са сваімі кампаніямі і праграмамі, дэманструючы відэаролікі і прээзнтацыі. Усяго на фэсьце 28 арганізацыяў прадставілі свае стэнды, 11 - відэаролікі, 17 - прэзэнтацыі сваіх праграмаў. Журы адзначыла прызамі тры лепшыя прадстаўленьні.

Урэшце, удзельнікі VI Асамблеі ўхвалілі шэраг рэзалюцыяў, заклікаючы ўрад правесьці рэальную лібэралізацыю, нармалізаваць стасункі з грамадзкім сэктарам, скасаваць усе формы палітычных рэпрэсіяў, і ўключыць грамадзянскую супольнасьць ў дыскусію аб мэтазгоднасьці пабудовы АЭС у Беларусі.

*Паводле рассылкі belngo.info*

# Трагедыя



У другі дзень працы з Салігорска прыйшла жудасная навіна – скончыла жыцьце самагубствам тамтэйшая актывістка й праваабаронца, трыццацітрохгадовая Яна Палякова, якую мясцовыя “абаронцы Закону” баяліся настолькі, што прыгаварылі да “хіміі”. Жаньчына выбрала свабоду, заплаціўшы ўласным жыцьцем. Вечная памяць ёй і вечная ж ганьба халуям у пагонах.

Працяг гэтай тэмы – на наступных старонках.

*Іван МАРОЗАЎ*

# Патраеньне асобы



Гэтаая тэма набыла актуальнасьць амаль што з пачаткам паседжаньняў. Кім, насамрэч, есьць людзі, якія сабарліся ў залі? Ня першы раз, дарэчы, чую такое пытаньне, але спробы адназначна адказаць на яго даўно ўжо адклаў у бок, бо прыйшоў да высновы, што такога адказу не існуе. Многія з тых, хто ўваходзіць у грамадзкія фарміраваньні, адначасова есьць і сябрамі партыяў, і журналістамі, і.г.д. Сам я, дарэчы, уваходжу ў партыю БНФ, ГА БНФ “Адраджэньне”, Рух “За свабоду”... Ну і куды ж мне цяпер? Да разумных, ці да прыгожых? А можа, калі есьць сілы і жаданьне да працы, лягічней махнуць рукою на “палітычныя забабоны”, ды проста рабіць, што можаш?

Найбольш востра такое пытаньне паўстала падчас вылучэньня дэлегатаў у працоўныя органы Асамблеі. Прынамсі, той-сёй зь меньчукоў абвінаваціў Вінцука Вячорку (на фота) ў тым, што ен... сябар партыі, і, маўляў, не мае права ўваходзіць у грамадзкае аб’яднаньне. У сваім выступе (да гонару арганізатараў магчымасьць выказацца давалася ўсім, хто меў, што сказаць) Вінцук нагадаў, што ен адначасова адзін зь кіраўнікоў ГА “БНФ Адраджэньне”.

- Як бы нам гэтага ні хацелася, але “хімічна чыстага” грамадзкага сэктару ў сучаснай Беларусі быць ня можа. – Працягнуў сп.Вячорка.

Падтрымалі аднаго з заснавальнікаў нацыянальнага грамадзкага руху й іньшыя выступоўцы. І сапраўды, калі трымацца гэтай лёгікі, дык партыйцам, што? - трэба цяпер выключаць са савіх радоў сябраў ГА? Во сьмеху будзе! І ўсіх грамчэй стануць рагатаць, напэўна, супрацоўнікі розных “кантор”, якія, дагэтуль і ў снах ня бачылі такой лафы – дэмакраты разганяюць адзін другога. АМАП адпачывае.

Відавочна, разумеўшы абсурднасьць выказаных прэтэнзіяў, іх аўтары падчас галасаваньня сыйшлі з залі.

*Эдуард БРОКАРЕЎ*

# Кіно

З дванадцаці відэаролікаў, якія былі прадстаўленыя на суд арганізатараў, сем паходзіла з Магілеўскай вобласьці. Актывісты з нашага абласнога цэнтру зьнялі вельмі якасны фільм пра абласную грамадзкую супольнасьць. Горкі былі прадстаўленыя шасьцю невялікімі відэапрэзэнтацыямі. Ды яшчэ адзін мініфільм распавядаў пра дзіцячы летнік "Захаваем Беларусь для нас!", які праводзілі на Дрыбіньшчыне мінскія маладзены. Разам з апошнімі ў ліку ляўрэатаў, урэшце, апыніліся магіляўчане, ды яшчэ адна менская каманда студэнтаў.



Стэндаў жа з самай рознай "інфой" было нашмат больш, але іх чамусьці ніхто не ацэньваў.

ГОРАЦКІЯ АКТЫВІСТКІ КАЛЯ СУПОЛЬНАГА СТЭНДУ

# Пярэдні край



"Самым важным з прынятых дакумэнтаў" назваў вядомы беларускі змагар зь "мірным атамам" Юры Варонежцаў рэзалюцыю, прынятую напрыканцы другога дня працы Асамблеі. І сапраўды – больш важнага пытаньня для нашае дзяржавы зараз не існуе. І справа ня толькі ў тым, будзе АЭС бясьпечнай, ці не.

Ня меньш важным ёстьць тое, што ад працэсу падрыхтоўкі канчатковага рашэньня цалкам адсунутая грамадзкасьць. Прывязка да адносна танных, але састарэўшых расейкіх тэхналёгіяў пагражае стратай ня толькі энергетычнай, але й палітычнай незалежнасьці...

Тыя ж зь людзей, хто шчыра хоча не дапусьціць будаўніцтва станцыі, альбо разрозьненыя, альбо ня ведаюць толкам, што рабіць. Нельга ж назваць агульнанацыянальнай кампаніяй преакідваньне з сайта на сайт "грозных" артыкулаў, нагадваючых вядомыя галасы ў пустыні. Толькі пустыня ў нашым выпадку пагражае стаць яшчэ й радыеактыўнай.

І вельмі своечасовым і правільным быў заклік сябра Горацкай антыядзернай групы Андрэя Юрковаісьці да людзей, несьці да іх праўдзівую інфармацыю. Вялікія спадзевы беларускія антыядзершчыкі ўскладаюць тут на ГА "Цэнтар падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятываў", які літаральна днямі быў зарэгістраваны Мін'юстам.

АСТРАВЕЦКІМ ЗМАГАРАМ ЗЬ "МІРНЫМ АТАМАМ" М. УЛАСЕВІЧУ ДЫ І. КРУКУ ЗАРАЗ ЯК НІКОМУ ІНЬШАМУ ПАТРЭБНАЯ ПАДТРЫМКА

# Актуальна

Асноўнымі праблемамі грамадзкага сэктару Беларусі ўдзельнікі часьцей за ўсё называлі ўзаемаадносіны з уладамі (дакладней – амаль што поўную немагчымасьць іх наладзіць, спыніўшы "гульню ў адны вароты"), а таксама нізкі ўзровень камунікацыяў паміж сабою. Тут, на мой погляд, поле неаранае для абранай працоўнай групы. Некалі добра й карысна працаваўшы сайт belngo.info зараз ня дзейнічае, але ж, братцы, на двары XXI стагодзе. Свае інтэрнэт-рэсурсы маюць ужо нават школьнікі. Таму й арганізацыю, у якой няма ўласнага сайту, успрымаць усур'ез будуць наўрад ці.

№47 САКАВІК 2009 Выбар

# РЭЗАЛЮЦЫЯ
## VI Асамблеі няўрадавых арганізацыяў ды ініцыятываў Беларусі

Прынятая 6-га сакавіка

Мы, прадстаўнікі няўрадавых арганізацыяў Беларусі, грунтуючыся на каштоўнасьцях дэмакратыі, прававой дзяржавы і павагі да правоў чалавека

- Канстатуем асобныя крокі беларускіх уладаў, скіраваныя на набліжэньне стасункаў паміж грамадзянскай супольнасьцю і дзяржавай у Беларусі да эўрапейскіх стандартаў.

- З занепакоенасьцю адзначаем, што пакуль гэтыя крокі не зьвязаныя з сыстэмным паляпшэньнем становішча ў галіне правоў чалавека, у тым ліку свабоды асацыяцыяў.

- Заклікаем ўлады да забесьпячэньня публічнасьці і свабоды выказваньняў у справе наладжваньня грамадзкага дыялёгу ў краіне.

- Патрабуем неадкладнага і незваротнага выключэньня зь беларускага палітычнага жыцьця практыкі крымінальнага і іншага пераследу палітычных апанэнтаў, дзеячоў грамадзянскай супольнасьці, журналістаў.

У якасьці першачарговых крокаў у кірунку нармалізацыі становішча структураў грамадзянскай супольнасьці павінныя быць:

- Адмена ганебнага артыкула 193-1 Крымінальнага кодэксу, наяўнасьць якога практычна заганяе ў падпольле амаль любую самстойную ініцыятыву грамадзянаў, а таксама скасаваньне артыкулаў 367-369, 369-1 Крымінальнага кодэксу, што выкарыстоўваецца для пераследу журналістаў*.
- Набліжэньне да заяўляльнага прынцыпу рэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў з магчымасьцю рэгістрацыі па месцы жыхарства іх заснавальнікаў (як тое ўжо магчымае для камэрцыйных юрыдычных асобаў).
- Выкананьне рашэньняў Камітэта па правах чалавека ААН і іншых міжнародных органаў што да выпадкаў неабгрунтаванага абмежаваньня і парушэньня правоў чалавека ў Беларусі.

- Заяўляем аб намеры працягваць дзейнасьць на карысьць беларускага грамадзтва дзеля пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы і разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці нягледзячы на неспрыяльныя прававыя ўмовы для такой дзейнасьці.

- Зьвяртаемся да міжнароднай супольнасьці з просьбай не губляць увагі да сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі. Каштоўнасьць дыялёгу зь беларускім урадам не павінная прыніжаць важнасьць прынцыпаў правоў чалавека, якія папаранейшаму знаходзяцца пад пагрозай у Беларусі. Правы чалавека ня могуць і не павінныя быць прадметам гандлю і саступак.

*Артыкулы 193-1 "Незаконные организация деятельности общественного объединения, религиозной организации или фонда либо участие в их деятельности", 367 "Клевета в отношении Президента Республики Беларусь", 368 "Оскорбление Президента Республики Беларусь", 369 "Оскорбление представителя власти", 369-1 "Дискредитация Республики Беларусь".

# РЭЗАЛЮЦЫЯ
## VI Асамблеі няўрадавых арганізацыяў ды ініцыятываў Беларусі

Прынята 07.03.2009

Уладамі Беларусі агучаны пляны будаўніцтва атамнай электрастанцыі. Палітычнае рашэньне было прынятае з парушэньнем Орхускай канвэнцыі і дзейснага нацыянальнага заканадаўства, без шырокай грамадзкай дыскусіі аб эканамічнай і экалягічнай мэтазгоднасьці ўзьвядзеньня АЭС у Беларусі, а таксама, вызначэньня месца яе разьмяшчэньня і выканаўцы будаўніцтва.

Была праігнараваная пазыцыя незалежных экспэртаў, спэцыялістаў, навукоўцаў, прадстаўнікоў грамадзкіх арганізацыяў і рухаў, грамадзян Беларусі, якія рабілі спробы наладзіць адкрыты раўнапраўны дыялёг па гэтым пытаньні.

Мы, удзельнікі VI Асамблеі няўрадавых арганізацыяў ды ініцыятываў выказваем сваю нязгоду з рашэньнем аб будаўніцтве атамнай станцыі. Памятаючы аб трагедыі Чарнобыля, патрабуем скасаваць неабгрунтаванае і няўзгодненае з шырокай грамадзкасьцю рашэньне аб пабудове АЭС у Беларусі і патрабуем шырокага адкрытага абмеркаваньня гэтай праблемы на падставе дзейснага заканадаўства і міжнароднага права.

# ЗАЯВА
# Аб спыненьні ўсіх формаў палітычнага перасьледу

Прынятая 7 сакавіка 2009г.

Мы, прадстаўнікі няўрадавых арганізацыяў ды ініцыятываў Беларусі, заклікаем улады да спыненьня ўсіх формаў перасьледу па палітычных матывах. У тым ліку мы патрабуем:

- Вызваліць усіх асобаў, што знаходзяцца за кратамі ў зьвязку зь іх грамадзка-палітычнымі перакананьнямі, у тым ліку зьняволеных Арцёма Дубскага, Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава, Уладзімера Асіпенкі;
- Перагледзець вынікі гэтак званага "Працэсу 14-ці", паводле якога за ўдзел у мірным сходзе асуджаныя да абмежаваньня волі Аляксей Бондар, Міхал Крываў, Міхал Пашкевіч, Аляксандар Стральцоў, Аляксандар Чарнышоў, Тацьцяна Тышкевіч, Міхал Субач, Павал Вінаградаў, Максім Дашук і Аляксандар Баразенка;
- Спыніць практыку палітычна матываваных звальненьняў працоўных, ціску на іх сваякоў, адлічэньня з навучальных установаў;
- Спыніць практыку выкарыстаньня вайсковага прызыву ў якасьці пакараньня за актыўную грамадзкую пазыцыю, як гэта адбылося ў справах Зьміцера Жалезнічэнкі, Алеся Каліты, Франака Вячоркі, Зьміцера Федарука, Івана Шылы;
- Адмяніць незаконныя рашэньні аб прызнаньні інфармацыйных матэрыялаў экстрэмісцкімі , у тым ліку ў дачыненьні да часопіса ARCHE, а таксама спыніць далейшае злоўжываньне Законам Рэспублікі Беларусь "Аб супрацьдзеяньні экстрэмізму";
- Перагледзець усе незаконныя і неабгрунтаваныя з прававога гледзішча рашэньні аб адмове ў рэгістрацыі грамадзкіх аб'яднаньняў*.

* У 2008-2009 гг. адмовы ў рэгістрацыі былі вынесеныя больш чым пяцідзесяці ініцыятывам па стварэньні грамадзкіх аб'яднаньняў. Не атрымалі легальнага статусу Праваабарончае грамадзкае аб'яднаньне "Наша вясна", Рэспубліканскае грамадзкае аб'яднаньне "Ліквідатар", Сацыяльна-патрыятычнае грамадзкае аб'яднаньне "Гарызанталь", аб'яднаньні "Наша пакаленьне", "Брэсцкая Вясна", "Старшыя", "БХД", "За вольнае разьвіцьцё прадпрымальніцтва", "Малады фронт", "Маладыя сацыял-дэмакраты" ды іншыя.

# Аляксандр Мілінкевіч: Мэты Асамблеі не страцілі актуальнасць




На адкрыцці Асамблеі з прывітальным словам выступіў адзін са стваральнікаў Асамблеі, лідэр Руху "За Свабоду" Аляксандр Мілінкевіч:

– Гэта ўтварэнне – ўнікальны выпадак у посткамуністычных краінах. Падобнай парасоннай арганізацыі няма нідзе на гэтай прасторы. Усе мэты, якія былі пастаўлены 12 год назад, актуальныя і сёння. Гэта – каардынацыя дзеянняў, абмен інфармацыяй і досведам, узаемаабарона, падрымка новых грамадскіх ініцыятываў, – кажа Аляксандр Мілінкевіч.

На думку лідэра Руху "За Свабоду", сёння перад актывістамі грамадскіх аб'яднанняў стаяць сур'ёзныя задачы па дэмакратызацыі краіны, выхаванні ў людзей актыўнай пазіцыі, пачуцця адказнасці за лёс Беларусі.

У Асамблеі прымаюць удзел недзяржаўныя арганізацыі і ініцыятывы сацыяльных, палітычных, экалагічных, адукацыйных, праваабарончых ды іншых накірункаў.

Намеснік кіраўніка Руху "За Свабоду" Віктар Карнеенка лічыць сустрэчу прадстаўнічай:

– Мерапрыемства вельмі прадстаўнічае. Абмяркоўваліся сучасныя праблемы ў тэматычных і рэгіянальных групах. Тэмы абсалютна актуальныя: новыя дачыненні Беларусі і Еўразвязу, стратэгія дзейнасці няўрадавых арганізацый у новых варунках.

Гэты кангрэс прадстаўнікоў няўрадавых арганізацый шосты па ліку. Яму папярэднічалі абласныя сходы НДА і тэматычныя круглыя сталы. Асамблея існуе з 1997 году і мае значныя заслугі ў каардынацыі дзейнасці беларускага "трэцяга сектара". Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы для незалежных грамадскіх арганізацый у нашай краіне, грамадзянская супольнасць у Беларусі існуе і дзейнічае.

№47 САКАВІК 2009 Выбар

# Приговоренная к 2,5 годам «химии»

Правозащитница Яна Полякова, осужденная Солигорским судом, покончила жизнь самоубийством в ночь на 7 марта в Солигорске.

О самоубийстве Яны Поляковой объявили на Ассамблеи неправительственных организаций и инициатив, которая проходила 6-7 марта в Минске.

3 марта судом Солигорского района (судья Буравцов) был вынесен приговор по уголовному делу в отношении правозащитницы Яны Поляковой.

Правозащитницу осудили по части 2 статьи 400 Уголовного кодекса РБ – «Заведомо ложный донос».

На данном судебном заседании присутствовали правозащитники Леонид Мархотка и Валерий Щукин. Суд приговорил Я.Полякову к 2 годам и 6-ти месяцам ограничения свободы (так называемой «химии»), а также потребовал возместить «моральный ущерб» в размере одного миллиона рублей в пользу потерпевшего участкового милиции Пугачева В.А., который недавно вышел на пенсию.

Напомним, что в ноябре прошлого года большой резонанс получила история с преследованием солигорской правозащитницы со стороны правоохранительных органов. Яна Полякова сообщала, что за оппозиционную деятельность ее неоднократно задерживали сотрудники милиции. Также сообщалось, что в отделении женщину избивали, а однажды ей чуть не сломали руку. Необходимо добавить, что Яна Полякова являлась членом инициативной группы Ольги Козулиной во время последних выборов в «парламент».

- Для Яны этот приговор был шоком, - прокомментировал правозащитник Валерий Щукин. - Я почти целый день провел у нее после этого суда, но она твердила только одно: «Я не буду зечкой». Для нормального человека это действительно шок. Помню, когда меня посадили в первый раз, жена стеснялась в город выходить, ей казалось, что это позор. Видимо, так и у Яны произошло. Она видела полную свою беспомощность, неспособность что-то противопоставить этой травле. Я был на многих судах, но суд над ней был настоящий судилищем.

Как судили Яну Полякову?

Валерий Щукин рассказал подробности процесса над правозащитницей Яной Поляковой:

--- По долгу правозащитной деятельности я бывал на судебных процессах во многих городах Беларуси, наблюдал за работой десятков судей, но с подобным экспресс-процессом сталкнулся впервые. 3 марта 2009 года представитель прокуратуры Солигорского района огласил в зале суда постановление о привлечении Яны Поляковой в качестве обвиняемой. При этом государственный обвинитель заявляет, что уголовное дело возбуждено по требованию прокуратуры Минской области. Солигорская прокуратура уголовное дело в отношении Поляковой не инициировала. Судья Буравцов данное постановление тут же вручает обвиняемой.

Дальнейшие судейские действия регламентированы статьей 316 УПК, которая гласит:

- в случае изменения обвинения (а именно это и произошло, т.к. государственный обвинитель внес изменения в обвинение) судебное разбирательство дела не может быть начато ранее пяти суток со дня вручения копии измененного постановления о привлечении в качестве обвиняемой.

Но судья Буравцов продолжил заседание… немедленно. Яне Поляковой не то что пяти суток - пяти минут не было предоставлено для изучения постановления о привлечении в качестве обвиняемой. Судья даже не объявил перерыв в заседании, чтобы Яна могла ознакомиться с прокурорским постановлением.

Причину столь вопиющего нарушения процессуального закона я вижу лишь одну -- страстное желание судьи Буравцева сделать родной милиции подарок к празднику: придать солигорскому правозащитнику статус зека. Судья так торопился, что по новому обвинению не допросил ни пострадавшего милицейского капитана, ни свидетелей-сослуживцев оного, не огласил материалы дела.

Судилище над Яной Поляковой назвать процессом язык не поворачивается. Потому как сразу же после предъявления нового обвинения государственный обвинитель начать выступать… в прениях.

Из этих двух процессуальных элементов и состоял судебный процесс по обвинению Яны Поляковой в совершении преступления по части второй ст.400 УК (заведомо ложный донос в совершении должностным лицом тяжкого преступления). Государственный обвинитель даже указал статью этого тяжкого преступления - 426 (часть 3).

Называется статья -- превышение власти или служебных полномочий (совершение должностным лицом явно выходящих за пределы прав и полномочий, предоставленных по службе, сопряженное с насилием, мучением, оскорблением потерпевшего).

Но это не совсем так, или, как говорят в подобных случаях, совсем не так.

Из заявления Яны Поляковой в районную прокуратуру:

«…Капитан Пугачев В.А. предложил мне подписать какие-то бумаги. Когда я попыталась ознакомиться с данными бумагами, по находившейся на столе моей правой руке последовал сильный удар. Данный удар нанес капитан Пугачев В.А. От резкой боли и от испуга я вскочила со стула, на котором сидела.

Я не ожидала такого поступка со стороны данного работника милиции. В состоянии шока, попыталась выскочить из кабинета, при этом, повернувшись к находившимся в кабинете гражданам спиной, получила удар по обеим ногам….

# правозащитница покончила с собой

ПРОШУ:

-- прокурорского реагирования на данные действия работников Солигорского РОВД, направленные на подавление демократического движения политической активности закрепленной Конституцией Республики Беларусь.

--назначить судебно-медицинскую экспертизу по фиксированию имеющихся у меня телесных повреждений.»

Из заявления Яны Поляковой в Минскую областную прокуратуру:

«...Я, Полякова Яна Витальевна, являюсь членом инициативной группы кандидата в депутаты Ольги Александровны Козулиной.

С 26 августа 2008 года мне на домашний номер, а затем и на мобильный телефон, периодически поступали звонки с требованием встретиться, якобы с сотрудниками Солигорского КГБ и дать объяснения по поводу моего участия в сборе подписей в поддержку Ольги Козулиной.

В телефонных разговорах с данными лицами, я просила предоставить мне надлежащим образом оформленную повестку. На мои просьбы следовали сначала отказы, а затем угрозы в мой адрес и в адрес моей мамы.

Далее начали следовать звонки, якобы от работников милиции, звонившие мужчины, в свою очередь, уже требовали встретиться с ними и дать объяснения по поводу моего «нежелания» общаться с представителями КГБ.

ПРОШУ:

-- прокурорского реагирования на данные действия работников Солигорского РОВД, направленные на подавление демократического движения политической активности закрепленной Конституцией Республики Беларусь;

-- назначить судебно-медицинскую экспертизу по фиксированию имеющихся у меня телесных повреждений;

-- отменить постановление об отказе в возбуждении уголовного дела от 11 сентября 2008 года, вынесенного прокуратурой Солигорского района.»

Из заявления Яны Поляковой в Генеральную прокуратуру:

...ПРОШУ:

-- прокурорского реагирования на данные действия работников Солигорского РОВД, на подавление демократического движения политической активности закрепленной Конституцией Республики Беларусь;

-- назначить судебно-медицинскую экспертизу по фиксированию имеющихся у меня телесных повреждений.

Во всех обращениях правозащитника Поляковой в прокуратуры не то, что обвинения, даже намека нет на превышение милицейским капитаном Пугачовым власти или служебных полномочий (то есть совершения последним преступления, за которое предусмотрена уголовная ответственность по ч.3 ст.426 УК).

И быть не может! Нанесение побоев не может выходить за пределы прав и полномочий, предоставленных по службе. Потому как ни Конституция, ни Уголовно-процессуальный кодекс, ни Закон о милиции (Об органах внутренних дел), ни постановления Министерства внутренних дел, ни распоряжения начальников, управлений и отделов внутренних дел не наделяют сотрудников милиции правом избивать граждан.

Как можно превысить власть или служебные полномочия которых нет?!

За действия сотрудника милиции Пугачева и двух его соучастников (как и для любого иного гражданина) предусмотрена уголовная ответственность по статье 149 или 153 УК (умышленное причинение телесных повреждений).

Увы, все прокуратуры Беларуси, отказались принять меры по определению степени тяжести телесных повреждений у Яны Поляковойи установлению обстоятельств их появления.

Подобные милицейские деяния (избиение) не есть превышение власти. Как не являются превышением власти совершение сотрудником милиции хищения, ложные показания в суде, изнасилование и тому подобные преступные деяния. В ходе судебного следствия (на предыдущем заседании) было установлено, что номер телефона, с которого по ночам угрожали Яне Поляковой, существует и принадлежит... правоохранительному органу. Но к ответственности за совершение преступных деяний против жизни и здоровья солигорчанки Поляковой никто не был привлечен. К сожалению, таковы правила, установленные в Беларуси правящим ныне режимом.

Не привлечен никто к ответственности и за действия, направленные на подавление демократического движения политической активности закрепленной Конституцией Республики Беларусь. А ведь именно в этом (в подавлении демократического движения) и заключалось суть обращения правозащитника в прокуратуру.

В два с половиной года «химии» (ссылка на принудительные работы) оценил солигорский судья Буравцов требования правозащитника Поляковой к прокуратуре пресечь противоправные действия, направленные на подавление демократического движения политической активности. А доблестному милицейскому капитану Пугачеву за проявленную храбрость в борьбе с правозащитником Яной Поляковой судья выписал, за счет последней, премию в миллион рублей (называется эта премия -- компенсация морального вреда). И действительно, волновался таки сей сотрудник Солигорского РОВД. Потому что мог и под уголовную статья попасть. Если бы, конечно, в Беларуси были другой суд и другое следствие.

Кстати, Яна Полякова обжаловать вынесенный политический приговор не собиралась. Она считала, что Минский областной суд вопиющего нарушения процессуального закона в данном приговоре не узреет.

№47 САКАВІК 2009 Выбар

# В Солигорске простились с Яной Поляковой

В Солигорске прошли похороны правозащитницы Яны Поляковой, которая 7 марта покончила жизнь самоубийством.

Как рассказала пресс-центру Хартии'97 сотрудница центра «Правовая помощь населению» Раиса Михайловская, похороны начались с опозданием - тело задержали в морге.

По словам Раисы Михайловской, в похоронной процессии учувствовали около 200 человек. Среди них – соседи погибшей, жители Солигорска, правозащитники из Молодечно и Минска. Также на похороны Яны Поляковой приехали: лидер минских предпринимателей Алесь Макаев, демократические активисты Вячеслав и Галина Сивчик, сопредседатель партии «Белорусская христианская демократия» Виталий Римашевский, правозащитник Валерий Щукин, дочь бывшего политзаключенного Ольга Козулина и другие. Как сообщают жители Солигорска, на похоронах был замечен заместитель председателя Солигорского райисполкома по идеологической работе Казакевич.

«Пришли простые люди со скромными венками и букетами, -- сказала пресс-центру Хартии'97 Раиса Михайловская. -- Они говорили, что в смерти Яны виноваты белорусские власти. Мама Яны Поляковой убита горем. Сидела возле гроба, плакала».

«Яна – боец, -- сказал во время похорон правозащитник Валерий Щукин. -- Она, как одинокий волк, бросилась спасать свой народ».

Сопредседатель партии «Белорусская христианская демократия» Виталий Римашевский в свою очередь подчеркнул, что белорусские демократы должны приложить все усилия, чтобы узнать, кто довел Яну Полякову до самоубийства, и найти виновных.

Многие присутствовавшие на похоронах Яны Поляковой просили прощение, что не поддержали ее в тяжелую минуту.

Напомним, что солигорская правозащитница Яна Полякова, осужденная Солигорским судом, покончила жизнь самоубийством в ночь на 7 марта.

Она являлась активисткой организации «Правовая помощь населению», сотрудничала с другими правозащитными организациями, входила в состав инициативной группы дочери Александра Козулина Ольги на «парламентских выборах» 2008 года.

3 марта судом Солигорского района (судья Буравцов) правозащитницу осудили по части 2 статьи 400 Уголовного кодекса РБ - «Заведомо ложный донос». Яну Полякову приговорили к 2 годам и 6-ти месяцам ограничения свободы (так называемой «химии»), а также потребовал возместить «моральный ущерб» в размере одного миллиона рублей в пользу потерпевшего участкового милиции Пугачева В.А., который недавно вышел на пенсию. А все потому, что именно этого милиционера Полякова обвиняла в избиениях. В ноябре прошлого года большой резонанс получила история с преследованием солигорской правозащитницы со стороны правоохранительных органов. Яна Полякова сообщала, что за оппозиционную деятельность ее неоднократно задерживали сотрудники милиции. Также сообщалось, что в отделении женщину избивали, а однажды ей чуть не сломали руку.

## КОММЕНТАРИЙ РЕДАКТОРА

Самые искрение соболезнования семье Яны. Щукин прав - она в одиночку бросилась спасать народ, а такую нагрузку и не каждый мужик выдержит.

НО

Нигде, ни нв одном сайте (в том числе - козулинском) я не нашел информации о том, как же Ольга Козулина и ее отец (люди с не самыми слабыми возможностями для этого в Беларуси) поддержали Яну в период репрессий против нее. Чем помогли? Юридической защитой? Информационной кампанией, слышимой по всему свету? Психологической поддержкой?

Слабая женщина, вытянувшая, как я понял, на себе избирательную кампанию Ольги, после выборов, по старой традиции беларуских столичных "борцов", была просто брошена на произвол судьбы.

"Синдром кольцевой дороги", которым давно уже страдают многие претенденты на титул "национального лидера", приезжающие в регионы за подписями и (коллеги из регионов не дадут соврать) исчезающие оттуда потом до очередных выборов, проявился здесь особенно ярко.

Чтобы подраться с охраной "национального собрания", или спросить "где деньги, Саша?", много ума и способностей не надо. А вот создать условия для системной поддержки тех, кто тебе помогает по всей стране, у таких вот "претендентов" кишка тонка.

При этом, Козулины не впервые подставляют поверивших им людей. Рискую нарваться на возмущение многих одно-думцев, но считаю, что А.К. в марте 2006-го абсолютно безответственно повел людей по неподготовленному и непроверенному маршруту, в результате чего завел их в ловушку, пофессионально расставленную и не мечтавшим о такой роскоши ОМОНОМ: бежать демонстрантам было фактически некуда и посторонних глаз - минимум. Потом Козулин оказался героем, которого спасали всем миром, а об избитых и задержанных людях вспоминать было некому, да и не с руки. За блеском "лидера" их маленькие трагедии смотрелись как-то тускло, если вообще были заметны.

Еще раз низкий поклон Яне и соболезнования ее близким, но задумайтесь те, кто собирается помогать этой компании дальше: не Вы ли - следующий?

*Эдуард БРОКАРЕВ*

# Разумная энергия

## или куда ведёт дорога на Островец

В 2009 ГОДУ В БЕЛАРУСИ, В ОСТРОВЕЦКОМ РАЙОНЕ ГРОДНЕНСКОЙ ОБЛАСТИ, НАЧИНАЕТСЯ СТРОИТЕЛЬСТВО АТОМНОЙ ЭЛЕКТРОСТАНЦИИ. ПОДПИСАНЫ ВСЕ НЕОБХОДИМЫЕ ДОКУМЕНТЫ, ЗАЛОЖЕНЫ СРЕДСТВА В БЮДЖЕТ. ТАКИМ ОБРАЗОМ, БЕЛОРУССКАЯ АЭС НЕОТВРАТИМО СТАНОВИТСЯ НАШЕЙ ОБЩЕЙ РЕАЛЬНОСТЬЮ. КАКОВА БУДЕТ ЭТА РЕАЛЬНОСТЬ, ПОКА МОЖНО ТОЛЬКО ГАДАТЬ. ДАЖЕ АЛЕКСАНДР ЛУКАШЕНКО, СТАВШИЙ С НЕДАВНИХ ПОР ПРИВЕРЖЕНЦЕМ АТОМНОЙ ЭНЕРГЕТИКИ, ВЫСКАЗАЛСЯ ПО ЭТОМУ ПОВОДУ ДОСТАТОЧНО СДЕРЖАННО: «Я ДУМАЮ, БУДУЩИЕ ПОКОЛЕНИЯ ОЦЕНЯТ НАШЕ РЕШЕНИЕ». НА МОЙ ВЗГЛЯД, С ПРЕЗИДЕНТОМ ЕСЛИ И МОЖНО СОГЛАСИТЬСЯ, ТО ЛИШЬ ЧАСТИЧНО. ВСЁ-ТАКИ МНЕНИЯ ЛЮДЕЙ ОБ АТОМНОЙ СТРОЙКЕ НИКТО НЕ СПРАШИВАЛ.

Ясно, что за столько лет правления САМИ ЗНАЕТЕ КОГО, белорусское общество свыклось с тем, что его просто ставят в известность об очередных судьбоносных решениях власти. Что поделаешь, граждане сами приучили чиновников действовать и вести себя соответствующим образом. Но ситуация с отечественным мирным атомом превзошла самые скептические ожидания общественности. Понятно, что власть имущие не сильно-то торопились узнавать иные взгляды и позиции, отличающиеся от их собственных. Волей-неволей к такому подходу все уже привыкли. Поразительно то, что в этот раз в защиту официальной точки зрения не было сказано ничего более менее убедительного.

В самом деле, разве кто-нибудь доходчиво и внятно, с цифрами и фактами на руках, объяснил нам, что даст Беларуси АЭС? Общие слова, кивания на мировой опыт, козыряние авторитетом президента — и больше ничего. Не известна даже стоимость многолетнего грандиозного строительства, затеваемого чуть ли не на авось. Вот что услышали журналисты от академика Михалевича, входящего в команду по подготовке атомного проекта РБ: «Мы участвовали в переговорах с рядом компаний. Единственный вопрос, на который мы никогда не получали ответа: примерно сколько всё будет стоить?». А вопрос этот, без сомнения, волнует сегодня очень и очень многих.

Следует исходить из того, что в ближайшие годы на «стройку века» потратят столько денег, что окупать расходы придётся не одно десятилетие. А ведь есть ещё космический спутник номер два, совместное белорусско-иранское автомобилестроение, целая туча ледовых дворцов (только в Могилевской области запланировано воздвигнуть аж восемь штук). Не знаю, хватит ли на всё финансов, но уверен, что нам, простым смертным, не хватит точно. И тут кроется главная причина несогласия с тем, что затевают сейчас в Островце. Можно долго перечислять плюсы и минусы атомной энергетики, но при этом непростительно забывать следующее. Только по-настоящему богатые страны могут позволить себе такое дорогостоящее энергоудовольствие. Беларусь в их число не входит и войдёт, судя по всему, не скоро.

Смотрите сами, в пятёрке стран-лидеров мировой атомной промышленности находятся США, Франция, Япония, Россия и Британия. Где тут наше место? Надо уяснить раз и навсегда, что государство, где пособие по безработице составляет менее 20 долларов, не имеет права втягивать своих граждан в ядерные авантюры. Слишком дорого это может обойтись. К тому же строительство атомных электростанций тот самый случай, где вход — рубль, а выход — два. Что делать с отслужившими свой срок АЭС — та ещё проблема! Сошлёмся на свидетельство Ольги Гурко, начальника отдела Проматомнадзора: «Вывод станции из эксплуатации занимает 4 года и стоит около 1 миллиарда евро». А если, не дай Бог, ещё одна девальвация?

Выход, а точнее решение, которое действительно оценят будущие поколения, находится не в атомной, а совсем в другой энергетике. Не зря её называют альтернативной, так как она представляет альтернативу якобы дешёвым и безопасным АЭС. Речь идёт о самых различных источниках энергии — ветер, солнце, биотопливо, водород и многое другое. Именно это перспективное направление современной энергетической отрасли заслуживает в наши дни самого пристального внимания, особенно в свете событий в Островецком районе. На эту тему необходимо дать высказаться специалистам, а также обеспечить условия для самого широкого общественного обсуждения проблемы. Что же касается так называемой альтернативной энергетики, то нельзя не прислушаться к мнению известной политической деятельницы, госсекретаря США Хиллари Клинтон: «Необходимо прекратить называть энергию альтернативной. Такое название предполагает тот факт, что она всего лишь альтернативная. Но на самом деле, такая энергия крайне необходима. Она чище, лучше и разумнее. Надо назвать ее разумной энергией». Согласитесь, что это правильное мнение. Добавим только, что разумная энергия — для разумных людей.

*Сергей АРЖАНЦЕВ*

№47 САКАВІК 2009 Выбар

# Усё “семінарым”...

У апошні час у мяне, як і ў шмат каго з маіх землякоў-бялынічан, пачало складвацца ўражанне, што наш Бялыніцкі раён па сваім фінансавым магчымасцям паступова пачаў набліжацца да эмірата Кувейт. Калі вы, паважаныя чытачы, запытаеце, чаму я прыйшоў да такой высновы, я з задавальненнем адкажу – а як інакш растлумачыць тую вялікую колькасць разнастайных семінараў, якія праводзяцца ў нас у раёне ў апошні час? Пры тым усё гэта адбываецца пад час крызісу, які апанаваў увесь свет і калі кіраўніцтва нават самых багатых краін старанна эканоміць літаральна кожны цэнт грошай. Праўда, як кажа наш правадыр, у Беларусі крызісу няма. Іншая справа, што, сапраўды, нашых “любімых” кіраўнікоў, пры іх узроўні даходаў, ніякія крызісы не закрануць, а простыя беларусы ўжо даўно лічаць апошнюю капейчыну, каб неяк выжыць.

Але нават некаторыя нашы вялікія начальнікі нарэшце зразумелі, што прыйшоў час эканоміць сродкі падаткаплацельшчыкаў. Нават прэм’ерміністр Сяргей Сідорскі расказаў уражаным чыноўнікам, што вось ужо пяць гадоў піша адной ручкай. Пасля гэтага па ўсёй “вертыкалі ўлады” распачалася шумная кампанія па эканоміі сродкаў на канцтаварах. Праўда, на мой погляд, нашмат прасцей зэканоміць грошы, калі рэзка скараціць колькасць гэтых самых “вертыкальных” чыноўнікаў. Ні для каго не сакрэт, колькі іх развялось за гады праўлення ўсенароднаабранага. Па дадзеных на пачатак 2008 года, чыноўнікаў ад улады стала ў 2, 5 разы больш, чым у 1990 годзе, пры тым, што насельніцтва Беларусі за гэты час скарацілась на 700 тысяч чалавек. Ды вы самі выдатна ведаеце, шаноўныя чытачы, колькі будынкаў у Бялынічах займаюць зараз розныя кіруючыя структуры. Адбываецца парадаксальная сітуацыя – з кожным годам народа ў Бялыніцкім раёне становіцца усё менш, а “слуг народа” – усё больш.

Напэўна, каб даказаць сваю патрэбнасць і значнасць, нашы шматлікія чыноўнікі і праводзяць семінар за семінарам, дзе дзеляцца са сваімі ж калегамі (дарэчы, за дзяржаўны кошт) шматлікімі “поспехамі”. Толькі ў лютым у нас у Бялыніцкім раёне адбыліся самыя разнастайныя семінары розных узроўняў: работнікаў культуры, райспажыўтаварыства, органаў мясцовай улады, сустрэча вонаў-інтэрнацыялістаў з чатырох раёнаў і г. д. На падрыхтоўку і правядзенне кожнага мерапрыемства было выкінута процьма дзяржаўных грошай, адрываліcь ад сваёй працы дзесяткі, калі не сотні, людзей. Усіх шматлікіх ўдзельнікаў трэба ж накарміць, павазіць па аб’ектах і г. д. Навошта так шыкаваць, калі наша самая стабільная ў свеце дзяржава выпрашвае крэдыты ў каго толькі можа (а калі не атрымае чарговы, дык можа быць поўны “стабілізец”), а простыя працаўнікі ўсе як адзін скардзяцца на зніжэнне заробкаў, я ніяк не магу зразумець. Калі грошы няма куды дзяваць, дык аказалі б лепш дапамогу дзецям з сем’яў з нізкім узроўнем даходаў ці маламаемым пажылым людзям. Дык не, лепш займацца такой “дурнёй”, як на рэспубліканскім семінары спажыўтаварыства: забраць стэлажы для тавараў з магазіна вёскі Вялікая Машчаніца і завезці іх для стварэння “паказухі” у Цяхцін, а пасля мерапрыемства вярнуць іх зноў на месца... І такіх “прыколаў” процьма...

Але самыя “цікавыя” уражанні ў мяне асабіста склаліся ад апошняга рэспубліканскага семінара, які праходзіў у нас у Бялыніцкім раёне. Напрыканцы лютага нашы “слугі народа” – дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь - вывучалі асноўныя накірункі рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі на прыкладзе Бялыніцкага раёна. Справа ў тым, што на вясенняй сесіі народныя абраннікі плануюць разгледзець новую рэдакцыю Закона Рэспублікі Беларусь “Аб асновах дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі”. Таму і вырашылі выехаць у рэгіёны, пагутарыць з выбаршчыкамі, паглядзець, як жыве і працуе моладзь. Наведваючы Бялыніцкі раён, парламентарыі азнаёміліся з работай маладзёжных вытворчых брыгад на МТК “Вялікая Машчаніца” і гатэльнага комплекса “Мара” ААТ “Новая Друць”, а таксама пабывалі ў маладзёжным цэнтры “Ветразь” і фізкультурна-аздараўленчым комплексе “Друць”. Зацікавіў дэпутатаў і вопыт СВК “Калгас “Радзіма” па замацаванню на вёсцы маладых працаўнікоў.

Мне асабіста стала радасна за народных абраннікаў, абсалютная большасць якіх – прадстаўнікі наменклатуры розных узроўняў, - што яны нарэшце зацікавілісь жыццём простага народа. Праўда, каб яны хацелі паглядзець сапраўдныя ўмовы жыцця і працы моладзі, яны б не ладзілі б семінар, напярэдадні якога некалькі тыдняў у нашым раёне старанна наводзілі “паказуху”, а проста б знянацку прыехалі і пахадзілі па вуліцах малых гарадоў і вёсак. Магчыма, тады б сапраўды змаглі даведацца, як жыве сучасная моладзь. А так толькі выкінулі дзяржаўныя грошы на вецер. Што з сапраўднага паўсядзённага жыцця можна было ўбачыць на жывёлагадоўчым комплесе ў вёсцы Вялікая Машчаніца, дзе напярэдадні семінара палова працаўнікоў ААТ “Новая Друць” старанна наводзіла лоск? Напярэдадні візіту высокіх гасцей жывёлаводы нават кароў мылі...Тое самае адбывалася і ў гатэльным комплексе “Мара”, дзе пад мудрым кіраўніцтвам райвыканкамаўскіх чыноўнікаў ухіляліcь магчымыя і немагчымыя недахопы. Пад канец пра гэта “кіраўніцтва” бедныя жанчыны, што там працуюць, пачалі выказвацца выключна ненарматыўнай лексікай, бо “дасталі” іх па поўнай праграме...Дабаўлю толькі, што на адзін лёгкі “перакус” для народных абраннікаў у кафэ “Мара” ААТ “Новая Друць” гаспадаркай было выдзелена тры мільёны рублёў...А колькі “ляснула” грошай на падрыхтоўку і правядзенне ўсяго семінара...

Самае цікавае - які вопыт вывучалі ў нас у Машчаніцы шаноўныя дэпутаты? Калі верыць дзяржаўнай прэсе, то вопыт працы

маладзёжных працоўных брыгад. Абласное тэлебачанне (праграма "Навіны-рэгіён) нават паведаміла, што дзякучы працы гэтых брыгад прадукцыйнасць працы на ўчастках, дзе яны працуюць, узрасла на 40%. Як такое можа быць, я не ведаю. Тыя маладыя людзі, што працуюць у маладзёжнай брыгадзе на комплексе у Машчаніцы, заслугоўваюць самай глыбокай павагі, бо праца гэта вельмі цяжкая. Але, усё жыццё пражыўшы у гэтай вёсцы, магу дакладна сказаць – з 5 членаў брыгады тры (ветурачы Міхаіл Шатарнаў і Сяргей Чалнакоў, мой сусед – механізатар Толік Козыраў) толькі некалькі месяцаў, як пачалі сваю працоўную дзейнасць і ніяк на прадукцыйнасць працы паўплываць немаглі. Іншыя два члены брыгады – галоўны заатэхнік Алег Шарснёў і заатэхнік-селекцыянер Аксана Думаронак - сапраўды працуюць ужо больш працяглы час і вялікае дзякуй ім за гэтую цяжкую працу. Аднак асноўная заслуга Аксаны, па словах раённай газеты "Зара над Друццю", гэта тое, што яна займалася вывядзеннем новых высокаўдойных парод кароў і павышэннем прадукцыйнасці жывёлы венгерскай селекцыі. Хачу паведаміць шаноўным калегам з раённай газеты, што, каб вывесці новую пароду кароў, шматлікія спецыялісты працуюць дзесяцігоддзямі і за часы незалежнасці Рэспублікі Беларусь не аднойновай пароды буйной рагатай жывёлы не створана. Ну а што датычыцца купленай за вялікія валютныя грошы жывёлы венгерскай селекцыі, то ні для каго ў Машчаніцы не з'яўляецца сакрэтам, што большая частка гэтай жывёлы даўно апынулася на мясакамбінаце. А чым маладым жывёлаводам дапамог ГА "БРСМ", наогул не вельмі зразумела – прыгожыя дзяўчаткі з нашага раённага камітэта гэтай арганізацыі кароў не кормяць і не дояць, а атрымліваюць свой неблагі заробак за "ідэйнае натхненне" моладзі. Можа, лепш бы натхнялі асабістым прыкладам дзе-небудзь на ферме, як камсамольцы 20-х гадоў, а не рабіліся маладымі бюракратамі? У маладзёжнай брыгадзе гатэльнага комплекса "Мара" наогул ў апошні час адбыліся скарачэнні і там зараз налічваецца тры чалавекі. Нейкі прыбытак гаспадарцы прыносіць толькі гатэль, кафэ "Мара" не пакрывае нават выдаткаў на сваё утрыманне.

Раённая газета "Зара над Друццю" адзначыла таксама, што аддзел па справах моладзі Бялыніцкага райвыканкама выйшаў пераможцай у сваёй падгрупе па рабоце з моладдзю. Тут я наогул не разумею – навошта на наш невялікі раён утрымліваць за дзяржаўны кошт дзве паралельныя структуры, якія павінны займацца праблемамі моладзі – аддзел па справах моладзі і райкам ГА "БРСМ"? Можа, сапраўды, нам няма куды грошы падзець? Бо, паверце мне на слова, сябрам маладзёжных апазіцыйных альбо хрысціянскіх арганізацый аддзел па справах моладзі нікoлі не дапамагаў. А ёсць жа яшчэ ідэалагічны аддзел райвыканкама, які займаецца, па-сутнасці, тымі самымі пытаннямі і супрацоўнікі якога таксама атрымліваюць вельмі нядрэнную зарплату. Дарэчы, узначальвае аддзел па справах моладзі паважаная жанчына – Лідзія Аляксандраўна Шчацінка, але ян даўно ўжо вышла з маладзёвага ўзросту і мае дарослых дзяцей. Як кажуць самі супрацоўнікі райвыканкаму, гэту пасаду ёй далі, каб яна магла дзе-небудзь перасядзець час, пакуль не пойдзе на пенсію кіраўнік аддзелу адукацыі райвыканкама Мікалай Пашкоўскі (Лідзія Аляксандраўна адна з верагодных кандыдатур на яго пасаду). На маю думку (і тут са мной пагаджаюцца абсалютна ўсе маладыя людзі, з якімі я гутарыў на гэту тэму) аддзел па справах моладзі, калі ён існуе, павінен узначальваць малады чалавек, які нашмат лепш ведае праблемы гэтай самай моладзі, бо з'яўляецца яе часткай.

Закончыць свой артыкул хочацца пажаданнем да кіраўнікоў нашага раёна: можа, на сам рэч, трэба перастаць выкідваць дзяржаўныя грошы на правядзенне нікому непатрэбных тусовак-семінараў, а пусціць іх на аказанне дапамогі маламаёмным грамадзянам? Калі ж ужо так хочацца "семінарыць", то праводзіць гэтыя мерапрыемствы можна за кошт уласных заробкаў нашых кіраўнікоў і шматлікіх спецыялістаў райвыканкама, яны ў іх, параўнальна з простымі працаўнікамі Бялыніцкага раёна, нядрэнныя.

*Барыс Вырвіч*

БАБРУЙСК

# ЗАПРАШАЮЦЬ ПРАГРАМІСТА ЗА 90 ДОЛАРАЎ

Бабруйскі гарвыканкам апублікаваў спіс вакансій у горадзе. У спісе змешчаныя 1632 прапановы для прадстаўнікоў розных прафесій, але заробкі прапануюцца вельмі нізкія.

Прадпрыемства "БДТПТК" прапануе дзве вакансіі: слесара-рамонтніка 4 разраду - 237 тыс. і інжынера-праграміста за 254 тыс. ОДО "Астранс-сэрсіс" запрашае слесара-аўтарамонтніка за 300 тыс. рублёў. ААТ "Аграмашсервіс" прапануе электраманцёру 3 разрада заробак у 350 тыс., а ААТ "Белтэлектрамантаж" за тую ж працу прапануе 432 тыс. Кіроўцаў спакушаюць працай за 250-370 тыс. рублёў. УУС Бабруйскага гарвыканкаму прапануе вакансію міліцыянта-кіроўцы за 750 тыс. рублёў.

Прапановы для некваліфікаваных працаўнікоў: "Бабруйскхарч" мае патрэбу ў прыбіральшчыцы на палову стаўкі за 85 тыс. рублёў. ААТ "Чырвоны харчавік» патрабуецца вартаўнік за 229 тыс. рублёў.

Незайздросныя вакансіі прапануюць і прадстаўнікам невытворчых прафесіяў. Кіраўнік гуртка ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання займее 213 тыс. на месяц. Раённы аддзел адукацыі шукае настаўніка тэатральнай дзейнасці на палову стаўкі за 150 тыс. рублёў, настаўніка нямецкай мовы за 300 тыс. рублёў і сацыяльнага педагога – за 350 тыс. Палац мастацтваў прапануе кіраўніку студыі 242 тыс. рублёў. Урачу-педыятру прапануюць 350 тыс.

Большасць прапановаў нават не набліжаюцца да абвешчанага на пачатку года Нацыянальным статыстычным камітэтам РБ сярэдняга заробку ў 919 тысяч рублёў.

# Бюджетникам снова снижают зарплаты?

Разговоры о том, что заработки в бюджетной сфере уменьшатся, появился еще несколько недель назад. Официальных документов по этому поводу в Минтруда и соцзащиты, которое курирует вопрос зарплат, нет.

«Никакого постановления или решения на счет снижения заработной платы не было», - заверил заместитель председателя комитета по труду, занятости, социальной защите Мингорисполкома Ю. Педченец.По его словам, этот вопрос даже не рассматривался. Невозможным считают снижение зарплат и в Минэкономики.

«Это было бы большой ошибкой, потому как из-за этого снизится спрос на внутреннем рынке», - убежден замминистра экономики Андрей Тур.

«Раньше планировали повышать зарплату и это было заложено в бюджет. Потом в декабре решили не поднимать, а потому сейчас нужно корректировать показатели. Получается, что это не понижение, а неповышение», - поделился своей версией один из представителей госорганов.

Как ранее сообщал пресс-центр Хартии'97, в результате резкой девальвации рубля зарплаты белорусов уменьшились на 100-300 долларов. Кроме того, зарплаты стали падать и в рублевом эквиваленте из-за урезания доплат и премий, а также отправки рабочих в вынужденные отпуска и сокращения рабочей недели.

# "Бабруйск-Арэна" не прыносіць прыбытку

"Бабруйск-Арэна" дагэтуль не можа выйсці на самаакупаемасць. Як паведамляе газета "Вечерний Бобруйск", начальнік аддзела спорту і турызма бабруйскага гарвыканкама М.Свістуноў звярнуўся да іншых начальнікаў аддзелаў гарвыканкама і кіраўніцтва за дапамогай па рэалізацыі квіткоў на канцэрт расійскага гурту "Звери".

На дадзены момант прададзена толькі 2.280 квіткоў на канцэрт, пры тым што, каб акупіць мерапрыемства трэба прадаць 4 тысячы.

На што першы намеснік гарвыканкама А.Кавалевіч звярнуў сваю ўвагу на тое, што згодна з даручэннем прэзідэнта Лядовы палац ужо з першага квартала мусіць фінансавацца за свой кошт, а не з бюджэту.

# Пры атрыманні хабару затрыманы высокапастаўлены чыноўнік

Супрацоўнікамі міліцыі затрыманы пры атрыманні хабару ў памеры 30 тысяч даляраў ЗША начальнік Бабруйскай горрайінспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, дэпутат Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў, галоўны дзяржаўны інспектар Уладзімір Алейнік.

У. Алейнік быў затрыманы ў сваім працоўным кабінеце пры атрыманні хабару за станоўчае рашэнне пытання пры азначэнні месца вывазу, засыпанні грунта і будаўнічых адыходаў ад аднаго з бабруйскіх індывідуальных прадпрымальнікаў.

Па дадзеным факце пракуратурай вобласці ўзбуджана крымінальная справа па частцы 3 артыкула 430 Крымінальнага кодэкса, вядзецца следства.

***Максім Запрудны***

УЛЫБНЕМСЯ




Выбар №47 САКАВІК 2009

Магілеўская абласная газэта. Выдавец: Магілеўская абласная кааліцыя дэмакратычных сілаў.

Галоўны радактар: Эдуард Брокараў, тэл. 545 89 83, электронная адрэса: brok61@yandex.ru
Наклад: 299 асобнікаў, фармат А4, 8 палос.
Падчас выданьня ужываюцца: беларуская (тарашкевіца), беларуская (наркомаўка) ды расейская мовы. Матар'ялы друкуюцца на мове аўтара. Палітычная й моўная цэнзура адсутнічае. Вітаюцца мастацкія творы, а таксама – журналісцкія матар'ялы на беларускай мове. Погляды аўтараў могуць не супадаць з пазыцыяй радакцыі. Радакцыя самастойна прымае рашэньні аб мэтазгоднасьці ўступленьня ў перапіску, а таксама аб разьмяшчэньні бясплатнай сацыяльнайракламы
У нумары выкарыстаны матар'ялы сайтаў: svaboda.org; racyja.com; milinkewits.org; pbnf.org; belsat.eu, uzgorak.na.by, atomby.net, charter97.org; horki.info.